

# «ПАРУСІЯ»

*Парусія – з грэцкай мовы – Другое прыйсце Гасподняе, якое павінна адбыцца пры скончэнні веку, калі князь гэтага свету раптоўна набудзе вялікую моц і статус, так што ніхто не зможа без яго загаду ці кляйна: «ні купляць, ні прадаваць» [Адкр 13, 18]. Нават многія верныя будуць пераможаныя гэтым злом, упэўненыя ў Антыхрысце як у божым сыне.

• **Рубрыку вядзе святар Яўген Маліноўскі, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт**

**12 лістапада адзначаліся 385-я ўгодкі пакутніцкай смерці святога Язафата Кунцэвіча. Ці магчымы псіхалагічны перанос гэтай падзеі на беларускую сучаснасць?**

Сяргей СЯРГЕЙЧЫК

Заўжды ў свеце крыж вымярае адну і тую ж з'яву: «Бог сіроты любе, але долі не дае». Гэта пра адзіноту, бо «цяжка быць чалавеку аднаму»[Быц 2, 18]. Гісторыя разводзіць у часе і прасторы шмат святых, якія сваім нонканфармісцкім тэмпераментам пераадольваюць самотную рэчаіснасць «маёй хаты скраю», ствараючы новы, метафізічны летапіс мужчын і жанчын, сведкаў парусіі. Крыж асабістай адыёзнасці высвятляе і ўзносіць іх любоў да радзімы як уласную свабоду.

Пачну здалёк. Ужо тысяча год, як скончыўся непакорлівы шлях вялікай княгіні Рагнеды Рагвалодаўны. Але нота яе годнасці «не разую рабыніча» аж да гэтага часу адбываецца крыжовым адбіткам псіхалагічнай свабоды ад рабства аўтарытэту: «Стварэнне скарылася марнасці не па добрай волі, а па волі таго, хто зґвалціў яго, спадзеючыся, што і само стварэнне вызвалена будзе з рабства тлення ў свабоду славы сыноў Божых» [Рым 8, 21]. У гэтай, незаангажаванай часам і прасторай, канкрэтна-гістарычнай форме дыскурса* канцэнтруюцца вытокі асобы, што вымяраецца еўрапейскай сістэмай каардынат як рэгулявання хаоса крэатыўных эмоцый: «дыскурс, – заўважае Мішэль Фуко, – раз і назаўжды падпарадкаваны ўладзе альбо супраць яе».

Канцэптуальнасць псіхалагічнага вобразу Рагнеды надае прысутнасць унутранага канфлікту як фактара высокай псіхаэстэтычнасці беларусаў, маючых занепакоенасць адносна сваёй свабоды (пазбегнуць палону ці падпарадкавацца лёсу). Позірк у мінулае з мэтай пошуку таго, што асэнсоўваецца сёння як «стабілізацыя», тлумачыць стагнацыйныя ўмовы краіны як наканаванай лёсам «нядолі», чаго нельга пазбегнуць, як Чарнобыля. Але патэрналісцкая ўпакоранасць у крыжовым вымярэнні накоплівае небяспеку «замаху» на дэспата. У гэтым, на наш погляд, адрозненне беларускага менталітэту ад «вечно бабьего в русской душе» (Н. Бердяев), г.зн. згоды да жыцця з «рабынічам», альбо чужым мужам.

У самасвядомасці сучаснага беларуса, як і ў вобразе Рагнеды, надаецца значная роля самаацэнцы, а не рацыянальнаму меркаванню свайго «Я». Калі, напрыклад, пры размове са студэнткай я выстаўляю патрабаванне да пасады прэзідэнта дзяржавы, несумяшчальнай з пералюбам, дык тая адказвае мне: «А кто сейчас не прелюбодей?». Мой ўпэўнены адказ – «Я»– ставіць крыж на ірацыянальнай індукцыі дзяўчыны.

Паганская падсвядомасць працягвае адбывацца разыходжаннем паміж навязанай ідэалогіяй, маральнымі прынцыпамі правіцеля і тым гаспадарчым, што набыло значэнне яго аўтарытэту. У супярэчлівых умовах краіны перавага аддаецца асобаснаму ўспрыманню сусвету. Такі кірунак у свядомасці Рагнеды выяўляецца непрыманнем эгаістычных памкненняў князя. Галоўным у жыцці Рагнеды становіцца эмансіпацыя жаночай годнасці і індывідуацыя свайго «Я». Гэты тыпова заходні стыль паводзін, адзначаны, прынамсі, выявамі багародзічнай самотнасці ў еўрапейскім мастацтве, назіраецца ў мацярынскай самасвядомасці манахіні Анастасіі (Рагнеды), стаўшай прычынай набожнасці і кніжнасці першага беларускага асветніка Ізяслава. Так ў беларускім інвайраменталітэце пашыраецца сфера самаактуалізацыі без статуса падпарадкавання рэжыму. Псіхалагічны выбар адбываецца праз бацькоўскую ахвяраванасць сваімі эвалюцыйнымі тэндэнцыямі дзеля рэвалюцыйнай артыкуляцыі краіны дзяцей.

Так чалавек стаўся наступнай альбо другаснай, пасля Бога, прычынай сусвету. Сінтэз Божага пачатку і асабістай ініцыятывы артыкулюе «Унію» (звяз) як ажыццяўленне вобразу беларуса ў крыжовай еднасці мужчынскага і жаночага, усходняга і заходняга, белага і чорнага. Усталяваннем уніяцкай царквы спалучаецца ўсходняя абраднасць з навукова-заходняй адукацыяй. Своеасаблівым сімвалам гэтай лучнасці стаў жыццёвы шлях Язафата Кунцэвіча, таленавітага прапаведніка і няўёмнага «душахвата», як тады яго называлі за энергічнае служэнне царкоўнай еднасці.

«Унія пачалася з палітыкі, а працягвалася як лёс народа, – сведчыць У. Арлоў. – Унія – велізарная і неадлучная частка гістарычнага быцця і культуры беларусаў, вера дзесяці пакаленняў нашых продкаў». Язафат стаўся другаснай прычынай народа, адыёзнай асобай, «притчей во языцех», адзін успамін аб якім аж да гэтага часу псуе настрой і бунтуе ірацыянальнае ўяўленне артадоксаў. Містыка лічбы 43 – колькасць пражытых год Язафата – адзначана 43 псальмай: «Ты зрабіў нас высмеяй паміж народамі, паківаннем галавы паміж чужынцамі»[Пс 43, 15].

Гэта апошняя акцыя барацьбы з самім успамінам аб уніяцкай гісторыі манастыра нагадала яе першую хвалю, звязаную з лютым забойствам ахібіскупа Полацкага Язафата Кунцэвіча 12 лістапада 1621г. Другая хваля адзначана гвалтоўным катаваннем казакамі ў 1657 г. каталіцкага святара Андрэя Баболі, 43 гады аддаўшага законнаму жыццю ордэна езуітаў, якія панеслі аж 49 ахвяраў у тыя страшныя часіны. Наступная хваля ганенняў адзначана забойствам пяцёх уніяцкіх святароў у Полацкім Сафійскім саборы царом Пётрам I у ліпені 1705 г. з руінаваннем самой гэтай святыні.

Цяжкія страты ад «самодержавия, православия, народности» неслі сотні уніяцкіх храмаў і кляштароў. Узімку 1707 г. расейская кавалерыя абрабавала ў Менску жаночы кляштар Святой Тройцы і Свята-Духаў сабор ордэна Бэрнардынцаў. Потым ганенні займелі больш «цывілізаваны» характар перабудовы уніяцкіх храмаў у праваслаўныя. Насамрэч, так званая рэканструкцыя апынулася, па ўспамінах Ігната Дамейкі, рабаваннем грэка-каталіцкіх святынь са знішчэннем аж 112 арганаў і 440 бакавых амвонаў, не лічачы ўжо перабудовы фасадаў і купалоў. Так цемрашальства адпомсціла Язафату за 82-адсоткавае далучэнне насельніцтва да царкоўнай еднасці, аб якой маліўся Ісус.

Перамагчы рагнедаву ізаляванасць краіны ў сусветнай супольнасці зараз, як і 400 год таму, яшчэ магчыма праз язафатава навяртанне да гэтай еднасці. Веданне ўласнай гісторыі, прыхільнасць да хрыстовай годнасці і сыноўняя любоў да «жанчыны, апранутай у сонца» [Адкр 12] складаюць перспектыву парусіі.

* Дыскурс – discere, блуканне – адмысловая практыка мовы, рэгулюемая не фармальнымі граматычнымі ўстановамі, але духоўнымі вытокамі асабістага пачуцця рэальнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ